# Некалькі дотыкаў да шэдэўра

***Хто не марыць дакрануцца да гісторыі? У прамым і пераносным значэнні такую магчымасць атрымае кожны! 27 верасня Нацыянальная бібліятэка Беларусі распачала серыю яркіх мерапрыемстваў «Берасцейская Біблія: адкрыты дотык», прысвечаных кніжнаму шэдэўру эпохі Адраджэння.***

У пачатку верасня арыгінал Берасцейскай Бібліі быў урачыста падараваны гораду над Бугам кіраўніком нашай краіны, а НББ падрыхтавала факсімільнае выданне знакамітага помніка. Верасень сімвалічны час яшчэ і таму, што менавіта ў гэтым месяцы кніга пабачыла свет у Берасці ў 1563 г.

У сувязі з гэтым НББ плануе правесці вялікі цыкл мерапрыемстваў самага рознага фармату і для рознай аўдыторыі, каб для ўсіх і кожнага прадэманстраваць сапраўдны шэдэўр нацыянальнай культуры.

Пад час першай сустрэчы была агучаная агульная праграма мерапрыемстваў «Берасцейскай восені». Усе ўдзельнікі мелі ўнікальную магчымасць пагартаць факсімільнае выданне Берасцейскай Бібліі і даведацца, да якой каштоўнасці дакранаюцца. Першы «дотык» – публічная лекцыя знаўцы беларускай кніжнай культуры, кандыдата культуралогіі Алеся Сушы – дала адказы на шматлікія пытанні пра самае загадкавае, прыгожае і дарагое выданне ў айчыннай гісторыі. А, на жаль (ці на шчасце?), пытанняў тут вельмі шмат.

Знаўца беларускай кніжнай культуры азначыў, што сёння ў нашай краіне, на дзіва, толькі пачынаецца працэс глыбокага вывучэння знакамітага кніжнага помніка. Хаця першыя навуковыя згадкі пра Берасцейскую Біблію ў Беларусі з'явіліся ўжо даволі даўно. Упершыню пра яе асаблівасці даволі падрабязна напісаў у 1572 г. вядомы беларускі і польскі рэфармацыйны дзеяч Сымон Будны.

А. Суша падкрэсліў, што наспеў час для шматаспектнай ацэнкі Берасцейскай Бібліі ў кантэксце нацыянальнай і агульначалавечай культуры як помніка сусветнай значнасці. Гэтаму будуць спрыяць, у тым ліку, мерапрыемствы праграмы «Берасцейская Біблія: адкрыты дотык».

З 28 верасня да 7 кастрычніка факсімільнае выданне Берасцейскай Бібліі было ў адкрытым доступе, і ўсе ахвотныя маглі яго пагартаць.

*Паводле інфармацыі навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства НББ*



*Фота з сайта nlb.by*